Таццяна Сапега





# XVII Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні

22–23 красавіка 2021 г.



Загадчык сектара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

22–23 красавіка 2021 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыліся XVII Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні. Выдзялім асноўныя адметнасці сёлетняга навуковага мерапрыемства:

- Канферэнцыя прайшла ў жывым фармаце, а таксама былі арганізаваны анлайн-трансляцыя і дыстанцыйнае падключэнне аддаленых удзельнікаў.
- За 2 дні на пасяджэннях прагучала больш за 80 дакладаў ад вучоных з 8 краін.
- Канферэнцыя аб'яднала кнігазнаўцаў, гісторыкаў, філолагаў, культуролагаў, тэолагаў, мастацтвазнаўцаў, філосафаў, педагогаў, спецыялістаў бібліятэк, музеяў і архіваў, якія прадставілі вынікі найноўшых даследаванняў па гісторыі рукапіснай і друкаванай кніжнай спадчыны.
- Кола пытанняў ахапіла ўсе важныя аспекты развіцця беларускай кніжнай культуры – ад старажытных рукапісаў да выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій на ўсіх этапах існавання кнігі.
- Зборнік XVII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў традыцыйна падрыхтаваны і выдадзены да канферэнцыі. У ім змешчаны тэксты 67 дакладаў.
- Пасля завяршэння канферэнцыі яе відэазапіс застаецца даступным для прагляду на канале YouTube.

У праграме мерапрыемства былі адлюстраваны наступныя пытанні:

- гістарычныя кніжныя калекцыі і правененцыі;
- рукапісная кніга і архіўныя дакументы;
- друкаваная кніга XVI–XVIII стст.;
- друкаваная кніга XIX–XXI стст.;
- перыядычны друк;
- мастацтва кнігі;
- персаналіі ў кніжнай культуры;
- тэорыя і метадалогія кнігазнаўства;
- кніга ў сучасным сацыякультурным асяроддзі.

Пасля завяршэння канферэнцыі арганізатары падвялі вынікі, каб вызначыць, наколькі праект дасягнуў сваіх мэт. Сваім меркаваннем пра канферэнцыю падзяліліся яе ўдзельнікі – беларускія і замежныя эксперты.

Спецыялісты Музея беларускага кнігадрукавання і Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага – філіялаў Нацыянальнага полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка кожны раз прымаюць удзел у кнігазнаўчых чытаннях, і гэты год не стаў выключэннем. Так, **Ашуева Вера Яўгенаўна**, вядучы навуковы супрацоўнік, і **Кашкур Дзіяна Андрэеўна**, старшы навуковы супрацоўнік Музея беларускага кнігадрукавання пакінулі наступны водгук пасля мерапрыемства:

*Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік выказвае шчырую падзяку за арганізацыю і правядзенне XVII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў. Навуковыя супрацоўнікі філіялаў музея-запаведніка – Музея беларускага кнігадрукавання і Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага штогод прымаюць удзел у чытаннях і адзначаюць высокі прафесійны ўзровень, насычанасць праграмы і аўтарытэтны склад удзельнікаў мерапрыемства. Для спецыялістаў, звязаных з вывучэннем кніжнай спадчыны Бела-*

*русі, вельмі важна мець магчымасць прадставіць актуальныя вынікі навуковых даследаванняў, увесці ў навуковы абарот новыя звесткі, а таксама ўстанавіць прафесійныя сувязі. Усё гэта забяспечвае Нацыянальная бібліятэка Беларусі, арганізуючы Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні. Лічым, што працяг традыцыі правядзення гэтага мерапрыемства мае прынцыповае значэнне для развіцця кнігазнаўчай навукі, і спадзяёмся на непарыўнасць гэтай традыцыі ў далейшым.*



**Шутава Вольга Міхайлаўна**, дырэктар Лабараторыі скарыназнаўства і валарызацыі даследаванняў гісторыі і культуры Беларусі, кандыдат гістарычных навук (Во-сюр-Сен, Францыя) прыняла ўдзел у Кнігазнаўчых чытаннях анлайн і даслала свой водгук:

*Вялікі дзякуй арганізатарам Кнігазнаўчых чытанняў за гэтае запрашэнне і магчымасць прыняць у іх удзел з дакладам! Гэты выдатны кнігазнаўчы форум, які вядомы і аўтарытэтны не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі, стаў ужо традыцыйным і разам з тым працягвае быць наватарскім. Для нас, удзельнікаў з-за мяжы, гэта асабліва важна – не толькі магчымасць выступіць і падзяліцца сваімі разважаннямі, назапашанымі часцяком «на дыстанцыі» ад аб'екта сваіх даследаванняў, але і шанец паслухаць меркаванне калег, даведацца пра актуальныя праблемы і новыя працы з «першых рук». Гэта стала магчымым дзякуючы выдатнай арганізацыі канферэнцыі, яе цёплай атмасферы, якая адчувалася нават з улікам вымушаных дыстанцыйных фарматаў, якія дарэчы былі вельмі добра наладжаны. Вельмі ўдзячная за ўвагу і каментары паважаным калегам, бо абмеркаванне і апрабацыя матэрыялу і разважанняў з'яўляюцца абсалютна неабходным этапам даследчага працэсу. Карыстаючыся выпадкам, прашу дасылаць свае каментары на адрас Лабараторыі скарыназнаўства, дзе яны будуць апублікаваныя ў раздзеле «Дыскусіі», прысвечаным інфармацыі аб XVII Кнігазнаўчых чытаннях, з шырокімі анонсамі на французскай і англійскай мовах. Зноўку дзякую арганізатарам і ўсім удзельнікам, здароўя, творчых поспехаў, плённага супрацоўніцтва!*

Супрацоўнікі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі з'яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі Кнігазнаўчых чытанняў. Сёлета ў канферэнцыі бралі ўдзел загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў **Сцефановіч Аляксандр Віктаравіч**, загадчык сектара кнігазнаўства **Цітавец Алена Іосіфаўна**, загадчык сектара рукапісаў **Жук Таццяна Іванаўна**, загадчык сектара абслугоўвання чытальнай залы **Слука Надзея Міхайлаўна**, навуковыя супрацоўнікі: **Губанава Вольга Аляксандраўна**, **Дзенісенка Алена Пятроўна**, **Навуменка Валерыя Георгіеўна**, **Ліс Марына Маркаўна**. Яны падзяліліся сваім меркаваннем:

*Выказваем падзяку арганізатарам XVII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, якія адбыліся 22–23 красавіка 2021 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, за насычаную і плённую праграму канферэнцыі, высокі прафесійны і арганізацыйны ўзровень. Несумнеўныя цікавасць, важнасць і актуальнасць уяўляюць вынесеныя на форум навуковыя тэмы. Хочацца адзначыць якасную падрыхтоўку зборніка матэрыялаў канферэнцыі. Правядзенне Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў мае шматгадовыя традыцыі і з'яўляецца значнай пляцоўкай для адмысloўцаў і даследчыкаў кніжнай культуры.*

**Шустава Юлія Эдуардаўна**, дацэнт кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і археаграфіі Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта, старшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела рэдкіх кніг (Музея кнігі) Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі, кандыдат гістарычных навук (Масква, Расія) неаднаразова прыязджала на Кнігазнаўчыя чытанні ў Мінск, а сёлета прадставіла цікавы даклад анлайн. Яна падзялілася сваімі ўражаннямі:

*Канферэнцыя атрымалася маштабнай і цікавай. Як добра, што новыя фарматы дазваляюць нам камунікаваць, абменьвацца досведам і навуковымі пошукамі! Далейшага развіцця Кнігазнаўчым чытанням! Вялікі дзякуй арганізатарам!*

Summary

In article summarizes the results of XVII International book readings in the National Library of Belarus.